Ірына ЗАНЕЎСКАЯ

# ТАМ, ДЗЕ ЛУНАЕ ДУХ КУПАЛЫ




*Уезд у вёску Яхімоўшчына.*
*На заднім плане славутыя катэджы.*

*Кожнага вялікага паэта нараджае народ, чыя самабытная культура і непаўторная гісторыя невычэрпныя, а таму не могуць без следу сысці ў нябыт і не адбіцца ў літаратуры. І ў кожнага паэта ёсць тыя — асаблівыя мясціны, дзе прайшлі шчаслівыя імгненні жыцця, мясціны, дзе ён упершыню адчуў прыналежнасць да сваёй Бацькаўшчыны, гонар за яе мінулае і патрэбу выказаць гэтыя пачуцці. Сёння, у 125-годдзе з дня нараджэння паэта, мы гаворым пра слаўнага сына Зямлі Беларускай, яго Песняра і Прарока — Вялікага Купалу. Успамінаем тыя мясціны, дзе Купала адчуваў сябе шчаслівым, дзе ствараў свае геніяльныя творы. Гэта і вёска Вязынка, дзе нарадзіўся паэт, і дзе са старадаўніх часоў на беразе рэчкі, што носіць такую ж назву — Вязынка, у чэрвеньскую ноч моладзь святкавала Купалле, самае старажытнае дахрысціянскае свята беларусаў. Акурат у гэтае свята і нарадзіўся будучы паэтычны геній, калі зацвітае, па паданні, папараць-кветка, якая прыносіць людзям шчасце. Літаратурны талент Купалы і сапраўды расквітнеў, і ўпершыню за многія гады беларускі народ адчуў сваю гістарычную значнасць і веліч. Гэта і Акопы — чароўнае месца на Лагойшчыне, якое для Купалы стала сапраўднай крыніцай натхнення, дзе былі створаны паэтычныя і драматургічныя шэдэўры: «Бандароўна», «Яна і я», «Магіла льва», «Паўлінка», «Раскіданае гняздо», «Тутэйшыя». Гэта і Ляўкі, мясціна ў Копыскім лясніцтве каля Оршы, дзе сярод высокіх соснаў на беразе Дняпра знаходзілася лецішча паэта, якое для немаладога ўжо Купалы было ратавальным прытулкам ад жорсткай і небяспечнай рэчаіснасці 1930-х гадоў. Гэта і дом у цэнтры Мінска, на тым месцы цяпер Літаратурны музей Янкі Купалы і парк яго імя, там сярод засені старых дрэваў узвышаецца бронзавы помнік паэту, а побач бруіць фантан з прыгожымі купалінкамі.*

*Згадаем сёння і тыя купалаўскія мясціны, дзе паэт сталеў менавіта як нацыянальны паэт. Месца, дзе Пясняр і Прарок Янка Купала здолеў па-філасофску асэнсаваць становішча свайго народа — народа, які ў пачатку XX стагоддзя адчуваў сябе лішнім на сваёй зямлі і быў ізаляваны ад сваёй гісторыі і культуры. Магутны паэтычны талент Купалы ўзняў духоўныя каштоўнасці нашага народа на новы ўзровень, вярнуў яму гістарычную спадчыну і пачуццё ўласнай годнасці. Безумоўна, месца, дзе паэт упершыню адчуў такія памкненні, не магло не адпавядаць душэўнаму стану будучага песняра. Велічная прырода, працавітыя і адораныя людзі натхнялі і ўмацоўвалі яго талент. Гэтае месца, якое залатымі літарамі ўпісана ў біяграфію Янкі Купалы і гісторыю нашай літаратуры, называецца Яхімоўшчынай.*

## «...ІШОЎ ПРАРОК ПЯСЧАНАЙ СЦЕЖКАЙ...»

Вёска Яхімоўшчына знаходзіцца непадалёк ад Маладзечна, яна вядомая яшчэ з XVI ст. Назва паходзіць ад прозвішча першых уладальнікаў сядзібы — Яхімовічаў. Потым уладальнікі мяняліся, кожны з іх прыўносіў у гэтыя прыгожыя мясціны нешта сваё, але не парушаў прыроднай гармоніі. А ваколіцы Яхімоўшчыны сапраўды вельмі прыгожыя і маляўнічыя: тут і палі, і пагоркі, і лес, і возера. І ўсё так гарманічна суіснуе паміж сабою і лашчыць вока, што, безумоўна, не магло пакінуць абыякавым сэрца і душу будучага паэта. Янка Купала, тады яшчэ 24-гадовы Ясь Луцэвіч, прыехаў сюды ў 1906 годзе, калі Яхімоўшчынай валодаў пан Любанскі. На той час у мястэчку працаваў бровар, куды кожную восень пан набіраў рабочых-вінакураў, маленькая цагельня, што выраблялa ў невялікай колькасці шасцігранную цэглу, празваную ў народзе «цэглікам» за свой невялякі памер і прыгожую форму. У сядзібным парку былі штучныя вадаёмы, дзе пан гадаваў ажно 15-кілаграмовых карпаў на продаж у Польшчу. Сядзібу ўпрыгожваў кампактны панскі маёнтак з летняй кухняй і двума масіўнымі свірнамі, падмуркі якіх складалі першабытныя камяні-валуны. У парку знаходзілася родавая каплічка, якая мела назву «майская». Побач з броварам месціўся будынак для пражывання чорнарабочых. Карацей, тыповае беларускае паселішча, якіх на той час было па ўсёй нашай краіне вельмі шмат.

Янка Купала ўладкаваўся на яхімоўскі бровар памочнікам да вінакура Сасноўскага. Бацькі Янкі Купалы — Дамінік Ануфрыевіч



*Былы летні панскі домік. Цяпер філіял Музея Я. Купалы «Яхімоўшчына».*



*Былы будынак панскага бровара. Цяпер культурны і аздараўленчы цэнтр СВК «Яхімаўшчызна».*

Луцэвіч і Бянігна Іванаўна з роду Валасевічаў — паходзілі з дробнай засцянковай шляхты, сваёй уласнай зямлі не мелі і вымушаны былі часта мяняць месца жыхарства ў пошуках арэнды і службы. Вядома, што такое жыццё адмоўна адбівалася на дабрабыце сям'і і вучобе дзяцей. Тым не менш Ясь Луцэвіч здолеў атрымаць пачатковую адукацыю, у 1898 г. ён скончыў Бяларуцкае народнае вучылішча. Не маючы магчымасці вучыцца далей, юнак займаўся самаадукацыяй, шмат чытаў. У 1902 г. будучага паэта напаткала цяжкае гора — смерць бацькі, брата і дзвюх сясцёр. Пасля смерці бацькі самому давялося заняцца гаспадаркай. Але праца арандатара была невыноснай. Малады Луцэвіч цвёрда вырашыў пачаць новае жыццё. Таму ў 1903 г. ён і пайшоў шукаць сабе службы. Даводзілася мяняць прафесіі і заняткі, весці зацятую барацьбу за кавалак хлеба. Быў ён і хатнім настаўнікам, і перапісчыкам у судовага следчага ў мястэчку Радашковічы, і малодшым прыказчыкам у маёнтку Беліца Магілёўскай губерні.

Вандроўнае жыццё апроч хібаў мела і станоўчы бок: яно адкрывала будучаму паэту шырокі прастор для пазнання роднага краю, спрыяла блізкаму знаёмству з людзьмі, прыносіла новыя ўражанні. Вясковыя людзі, з якімі жыў і працаваў Ясь Луцэвіч, вучылі яго любіць і шанаваць працу чалавека, былі першымі настаўнікамі. Юнак часта задумваўся над тым, чаму так пакутуе народ, дзе шляхі да свабоды. На гэтае пытанне малады чалавек шукаў адказу ў рэвалюцыйнай літаратуры. Яшчэ да 1905 г. ён пазнаёміўся з творамі Францішка Багу-



*Пакойчык у летнім доміку, дзе быў напісаны верш «А хто там ідзе?»*

шэвіча і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, пад іх уплывам пачаў пісаць па-беларуску. Само жыццё садзейнічала росту нацыянальнай свядомасці Купалы, дапамагала яму знайсці сваё прызванне і «служыць свайму народу ўсімі сіламі сваёй душы і сэрца». Яхімоўшчына не стала выключэннем. Маляўнічыя мясціны натхнялі маладога паэта, сяброўства з рабочымі бровара выклікала ў яго жаданне быць народным трыбунам, ён часта чытаў ім свае вершы, якія нараджаліся тут, і тут знаходзілі сваіх першых слухачоў.

У Яхімоўшчыне Купала пасябраваў з настаўнікам Андрэем Посахам, праз знаёмства якога з М. Горкім увесь свет даведаўся пра паэтычны талент Купалы. Гэта А. Посах паказаў знакамітаму рускаму пісьменніку купалаўскі сшытак вершаў, які потым стаў «Жалейкай» і верш «А хто там ідзе?». Верш так уразіў М. Горкага, што ён адразу пераклаў яго на рускую мову. З часам верш робіцца своеасаблівым гімнам простаму люду, на сёння ён перакладзены на 82 мовы свету! А напісаны верш у Яхімоўшчыне, у летняй кухні панскага дома, дзе Купала і жыў падчас працы на бровары. Дзіву даешся, калі толькі малады памочнік вінакура паспяваў апроч сваёй нялёгкай працы ствараць шэдэўры! «Пры якіх акалічнасцях ствараліся мае першыя вершы? Цяжка сказаць. Калі займаўся земляробствам, былі адны акалічнасці, калі працаваў на бровары — другія, але і ў тым і ў другім выпадку папера і алоўак былі заўсёды пры мне. І вось, на працы ў полі, або ў дарозе, або на начлезе прыйдзе думка — і я пішу. На бровары тое ж самае — ухітраюся адлучыцца, або нават у часе самой працы, калі павінен толькі назіраць, таксама пішу. Часам уначы, упацёмку запісваю, а днём перапісваю», — згадваў пазней Янка Купала.

Жыццё народа, яго легенды і паданні глыбока кранালі сэрца і душу песняра, станавіліся сюжэтамі ягоных ранніх паэм. Так, да прыкладу, у аснову паэмы «Нікому» (1906) лёг аповед селяніна з Яхімоўшчыны В. Л. Парфена пра трагічнае вяселле Тамаша і Алены. З часоў прыгону пераказвалася гэтая жахлівая гісторыя, а ў Янкі Купалы яна стала паэмай. Эпас краю рабіўся эпасам вялікага песняра. Так народны паэт вяртаў беларускаму народу гістарычнае мінулае,

вяртаў праз вобразы-сімвалы, праз трагічныя сюжэты, узятыя з жыцця.

Працуючы ў Яхімоўшчыне на бровары, пішучы свае першыя творы, Купала бачыць, з якім захапленнем успрымаюць яго вершы і паэмы. Ён пачынае разумець, што валодае дарам выказніка народных дум і спадзяванняў, што яго слова не пакідае абыякавымі ні простага селяніна і рабочага, ні багатых, уплывовых і адукаваных людзей. Апошніх у сваім жыцці Купала сустрэў нямала, менавіта яны першымі бачылі ў ім сілу і талент, усяляк спрыялі яго раскрыццю. Паэт спадзяецца на лепшую долю, ён ужо разумее, што не зможа працаваць дзеля кавалка хлеба, што яго чакае іншы лёс. І не памыляецца. Менавіта ў гэты час ён атрымлівае запрашэнне на працу ў «Нашу Ніву», дзе з вясны 1907 г. перыядычна друкуецца. Не вагаючыся, малады — тады яшчэ Янук Купала згаджаецца, бярэ разлік у пана Любанскага і з'язджае ў Вільню.

У яго жыцці пачынаецца новы перыяд. А ў Яхімоўшчыне ў памяці людзей назаўсёды застаўся 24-гадовы таленавіты і разам з тым сціплы, добразычлівы паэт, ягоныя сумныя песні-вершы пра іх цяжкае жыццё і палымяныя заклікі да новай і свабоднай долі.

## «АД ПРАДЗЕДАЎ СПАКОН ВЯКОЎ...»

Многія, хто запомніў і палюбіў маладога паэта ў Яхімоўшчыне, пранеслі сваю любоў і павагу да паэта праз усё жыццё і перадалі яе дзецям і праўнукам. Так, яхімовец дзед Рыгорка асабіста быў знаёмы з будучым паэтам, памятаў поціск ягонай рукі і сціплую ўсмешку. Памятаў і ўсведамляў велічнасць тых часоў настолькі, што змог перадаць гэтае пачуццё свайму праўнуку — **Генадзю Іванавічу Бажко**. Расповеды пра жыццё Купалы ў Яхімоўшчыне, пачутыя ад прадзеда і іншых людзей, якія таксама добра ведалі маладога памочніка вінакура, будучы старшыня саўгаса «Яхімоўшчына» запомніў назаўсёды. Жывое слова пра паэта з вуснаў ягоных сучаснікаў потым спрычынілася да аднаўлення таго дома, дзе некалі жыў Янка Купала, да надання будынку статуса музея.

Сам Генадзь Іванавіч не з Яхімоўшчыны, нарадзіўся ён у бліжэйшай вёсцы Зоранька, былыя Кабылкі, дзе і дагэтуль жывуць ягоныя сваякі. Атрымаў політэхнічную аду-



*Генадзь Іванавіч Бажко.*

кацыю, адслужыў у войску і пайшоў у калгас «Яхімоўшчына» працаваць галоўным інжынерам. Праз некаторы час энергічнага і актыўнага спецыяліста прызначылі кіраўніком гаспадаркі, дзе ён прапрацаваў ажно 21 год. Але што гэта былі за гады! Дзякуючы кемлівасці і рашучасці новага старшыні, гаспадарка ператварылася ў адну з лепшых у раёне, а па некаторых паказчыках дык і ўвогуле стала першай. Як кажа сам Генадзь Іванавіч, ён склаў сабе праграму мінімум, згодна з якой чалавек, які працуе на зямлі, павінен мець, як і гараджанін, васьмігадзінны працоўны дзень, жыллё з выгодамі, выхадныя, атрымліваць кваліфікаваную медыцынскую дапамогу. Усё пералічанае за гады яго кіравання і рэалізавана. Але спачатку трэба было стварыць калектыў аднадумцаў, прывабіць на працу новых людзей, бо ў самой Яхімоўшчыне людзей засталося не так і шмат: хто з'ехаў працаваць у іншыя саўгасы і калгасы, хто ў горад. А тыя, хто застаўся, таксама ваганіся, не было выгодных умоў як для працы, так і для жыцця.

І вось Генадзь Іванавіч стаў шукаць і запрашаць усіх тых, хто жадае працаваць, браў чарнобыльцаў. А каб людзі засталіся і надалей, пачаў будаваць дамы і ствараць разнастайныя выгоды для людскага жыцця. Ужо тады, 21 год таму, ён першы пачаў праводзіць у жыццё ідэю так званых аграгарадкоў. Будаваў катэджы з цэнтралізаваным ацяпленнем, запрасіў не толькі тэрапеўта,



*Вячаслаў Міхайлавіч Бажко.*

але і стаматолага і нават гінеколага. Цяпер у выпадку якой невялікай хваробы не трэба кожны раз ездзіць за 20 км у Маладзечна. Для бальніцы прыдаўся стары будынак, дзе некалі жылі чорнарабочыя пана Любанскага, якія працавалі на бровары. Пабудаваны ў 1897 г., ён добра захаваўся. Апроч амбулаторыі, тут месціцца банк, лазня, басейн і комплексна-прыёмны пункт. А маленькіх дзетак цяпер таксама не трэба вазіць у бліжэйшы населены пункт — Палачаны. Дзякуючы Генадзю Іванавічу, у Яхімоўшчыне адкрыты свой дзіцячы садок і пачатковая школа. Паклапаціўся энергічны старшыня калгаса і пра старых, тых, хто ўсё жыццё аддаў сельскай гаспадарцы, але ў канцы жыцця застаўся на самоце. Генадзь Іванавіч стварыў для такіх людзей першы ў раёне Дом састарэлых, забяспечыў іх бясплатным малаком і бульбай, каб яны адчулі хоць нейкую ўпэўненасць у заўтрашнім дні і тое, што іх не забылі.

На клопат супрацоўнікі адказвалі паспяховай працай. Калгас перайменавалі ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў (СВК) «Яхімаўшчызна», але ад гэтага профіль яго дзейнасці не змяніўся. Гаспадарка, дзе працуюць 180 чалавек, па-ранейшаму займаецца як вырошчваннем зернавых і тэхнічных культур, так і вытворчасцю малака і ялавічыны. Па ўраджаях кааператыў дасягнуў найвышэйшых вынікаў у раёне, а гэта не толькі азімая і яравая пшаніца, але і бульба, авёс, цукровыя буракі, рапс, бабовыя і зернебабовыя культуры. У «Яхімаўшчызне» людзі працуюць больш імпэтна, чым у суседніх гаспадарках, і ўраджай збіраюць багацейшы. З жывёлагадоўляй крыху горш, у гаспадарцы 600 кароў, ад кожнай надойваюць 15—16 літраў малака ў дзень, а гэта ўсяго толькі чацвёрты вынік па раёне. Але, безумоўна, неўзабаве і тут наладзіцца.

Ва ўсялякім разе, і надалей падтрымліваць такі ўзровень СВК збіраецца яе цяперашні кіраўнік **Вячаслаў Міхайлавіч Бажко**, які прыйшоў на месца Генадзя Іванавіча зусім нядаўна, літаральна пару месяцаў таму. Але гаспадарку сваю ведае цудоўна, бо дагэтуль ужо сем гадоў працаваў намеснікам старшыні СВК «Яхімаўшчызна», па-іншаму, быў правай рукой Генадзя Іванавіча. Да таго ж новы кіраўнік кааператыву, які родам з бліжэйшай вёскі Палачаны, мае да зямлі-карміцелькі самае непасрэднае дачыненне. Атрымаўшы адукацыю агранома, папрацаваўшы ў іншай гаспадарцы, ён пасля перабудовы спатрэбіўся і як землеўпарадчык у раённым савеце. Плюс досвед, атрыманы пры сумеснай працы з Генадзем Іванавічам. Так што за лёс цяперашняга сельскагаспадарчага кааператыву можна не турбавацца.

Што тычыцца былога кіраўніка СВК, яе знакамітага, ужо 52-гадовага Генадзя Іванавіча, то ён пайшоў на павышэнне і цяпер узначальвае Маладзечанскі камбінат хлебапрадуктаў, дзе пад яго кіраўніцтвам працуе 500 чалавек. Што і казаць, прадпрыемства вялікае, пасада адказная, але такому актыўнаму і дзейнаму гаспадару яна па плячы. І хаця ён усе свае намаганні аддае цяпер новаму калектыву, часам яго агортвае настальгія па Яхімоўшчыне, па тым месцы, дзе ён столькі год аддаваў свае сілы і энергію дзеля дабрабыту роднага калгаса і яго людзей. У такія гадзіны ён прыязджае ў дарагую сэрцу Яхімоўшчыну і разам з Вячаславам Міхайлавічам аглядае засеяныя нівы, што маляўніча раскінуліся сярод узгоркаў і лясоў маладзечанскай зямлі.

Баліць сэрца Генадзя Іванавіча і за сваё дзецішча, якому ён таксама аддаў нямала сіл і нерваў, якое літаральна адрадзіў наноў, і якім цяпер па праву ганарыцца. Гаворка ідзе пра філіял Музея Янкі Купалы ў Яхімоўшчыне, урачыстае адкрыццё якога адбылося 30 мая 2001г., якраз да 120-годдзя з дня нараджэння вялікага паэта.

## І НАВАТ КЛЯМКА ПАМЯТАЕ ДОТЫК ЯГОНАЙ РУКІ

Музей адчынены ў драўляным будынку былой летняй кухні, дзе жыў Янка Купала падчас працы на панскім бровары. Прайшло сто год, а дом, здаецца, і не збіраецца пад-

давацца няўмольнаму часу, усё ў ім цудоўна захавалася: і сцены, і дзверы, і прасторныя пакоі, і ганак са слупамі… Толькі дах у адным месцы праваліўся, і цяпер яго перакрываюць новай гонтай, менавіта гонтай, якой раней у мястэчках і вёсках нашай краіны пакрываліся амаль ўсе дамы. Калі трапляеш у музей, уражвае яго мастацкая кампазіцыя, якая ўвасабляе сабой шлях Беларусі і Янкі Купалы. Кожная зала мае свае адметныя сімвалы. Ёсць тут экспазіцыйныя залы, дзе на сценах можна пабачыць фотаздымкі Купалы, блізкіх яму людзей, яго паплечнікаў, копіі з яго публікацый у дарэвалюцыйным і савецкім друку. Музейныя экспанаты быццам пераносяць нас у пачатак XX ст. Так, звяртае на сябе ўвагу столік, за якім паэт працаваў у рэдакцыі газеты «Наша Ніва», настольная лямпа тых часоў. Уражвае інтэр'ер мемарыяльнага пакоя, дзе жыў, пісаў свае творы і мроіў малады паэт, дзе сабраны такія аўтэнтычныя рэчы, як пісьмовы стол з венскім крэслам, этажэрка з кнігамі, камода і шафа, якія некалі зберагалі невялікі скарб маладога Купалы. На стале — пісьмовыя прылады, падсвечнік, гадзіннік, які некалі адмяраў гадзіны жыцця паэта. Усё настолькі натуральна адлюстроўвае тыя часы, што, здаецца, бразне клямка, якая яшчэ памятае дотык Купалавай рукі, адчыняцца дзверы, і зойдзе сам паэт, які пакінуў гэты пакой усяго на некалькі гадзін, а цяпер вось вярнуўся зноў, каб сесці за стол, узяць асадку і напісаць: «Дайце мне волю, дайце арліную, // Вырвіце з путаў, аковаў!..»

Музея, напэўна, ніколі не было б, каб не добрая воля і настойлівасць Генадзя Іванавіча Бажко. Ужо з першага дня сваёй працы ў гаспадарцы ён паставіў мэту — аднавіць купалаўскі дом і стварыць музей, рэалізаваць колішнюю мару ўдавы Купалы Уладзіславы Францаўны, якая яшчэ ў 1959 г. прыязджала ў Яхімоўшчыну і рабіла захады па стварэнні там музейнай экспазіцыі. А колькі яму давялося дзеля гэтага паабіваць начальніцкіх парогаў, колькі прыводзіць доказаў як маладзечанскім, так і мінскім чыноўнікам, што Яхімоўшчына, дзякуючы паэту, мае для гісторыі і культуры Беларусі унікальнае значэнне. Паступова справа зрушылася з месца. Ды і нічога новага не трэба было будаваць, час, здавалася, асабіста спрыяў Купалу і ягонай спадчыне — і бровар, і панскі дом, і летняя кухня, дзе жыў паэт, цудоўна захаваліся. Належала толькі аднавіць будынак будучага музея. І хаця ў гэтым доме пастаянна жылі людзі, ён захаваўся амаль без зменаў. І ўсё таму, што ў ім прыезджыя людзі сяліліся ненадоўга, а каб перачакаць, пакуль калгас пабудуе ім сталае і надзейнае жытло. Таму нічога і не перараблялі ў доме, не зносілі перагародак, не мянялі планіроўку, а толькі рабілі невялічкі касметычны рамонт: фарбавалі падлогу, бялілі сцены. Усё гэта можна было выправіць, што са сваёй няспыннай энергіяй і пачаў неадкладна рабіць Генадзь Іванавіч. Але спачатку ён завітаў у Мінск да дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы Жаны Дапкюнас, падзяліўся з ёй сваёй ідэяй. Разам яны распрацавалі канцэпцыю аднаўлення старога дома і будучай экспазіцыі. А калі ўсё было зроблена, і музей нарэшце адчынілі, аказалася, што гэта адзінае жывое месца, якое не змянілася з часоў




*Адноўлены інтэр'ер рэдакцыі газеты «Наша Ніва».*



*Святлана Уладзіміраўна Ціс паказвае фотаздымак гаспадара самавара.*

Купалы, і дзе дагэтуль лунае ягоны дух. Цяпер музей — гонар усяго Маладзечанскага раёна, сюды завітвае кожны, хто неабыякавы да роднай літаратуры.

Цяперашняя загадчыца музея **Святлана Уладзіміраўна Ціс** робіць пакоі музея пажаночы ўтульнымі. Святлана прыехала з Гародні, дзе атрымала адукацыю харэографа. Прыехала за мужам, якога размеркавалі сямейным доктарам на працу ў калгасную амбулаторыю. Ёй здавалася, што гэта часова, на некалькі гадоў, не хацелася гарадской дзяўчыне пераязджаць назаўсёды ў вёску. Але яна па-сапраўднаму палюбіла Яхімоўшчыну. А тут і Генадзь Іванавіч прапанаваў ім з мужам катэдж з усімі выгодамі. Ну як тут не застацца! Вось і праляцелі семнаццаць год як адзін, і цяпер Святлана не ўяўляе свайго жыцця без маладзечанскіх краявідаў і музея. За гэтыя гады музей для яе зрабіўся сапраўды сваім. Вывучаючы біяграфію Янкі Купалы, шукаючы для музея экспанаты, слухаючы расповеды людзей, якія памяталі паэта, а такіх яна яшчэ заспела, Святлана загарэлася шчырай любоўю да самабытнай культуры сваёй краіны. Яе зацікаўленасць і жаданне зрабіць як мага больш для музея адчувалі і людзі, таму ўсяляк ёй дапамагалі. Так, 90-гадовая Сцепаніда Шаўчэнка, чый бацька працаваў некалі ў пана Любанскага сталяром, перадала музею той самы самавар, за якім паэт і сталяр не раз сядзелі за гарбатай. Самавар, дарэчы, быў падараваны сталяру панам за добрую працу. Бабуля Сцепаніда расказала Святлане і пра унікальныя сутарэнні пад домам-музеем, дзе некалі месціліся адмысловыя печы для прыгатавання ежы для паноў, калі яны падчас палявання пераязджалі ў гэты летні домік.

Узнікла ідэя адрэстаўрыраваць тыя сутарэнні пад домам-музеем, а з імі заадно і панскі дом, у якім сёння месціцца кантора сельскагаспадарчага кааператыва, і тыя свіраны, што засталіся ад былога маёнтка і цудоўна захаваліся, нягледзячы на свае паўтара стагоддзя, і шмат чаго іншага. Але ўсё гэта наперадзе. А пакуль усе рыхтуюцца да чарговага Купалля. Правядзенне гэтага свята стала для Яхімоўшчыны і яе жыхароў добрай традыцыяй з падачы Генадзя Іванавіча Бажко. Задумвалася яно як альтэрнатыва штогадоваму маладзечанскаму фестывалю. Ужо 14 год узапар 6 ліпеня збіраюцца непадалёк ад музея мясцовыя і прыезджыя людзі, каб яшчэ раз узгадаць знакамітага паэта і адсвяткаваць Купалле, а заадно падрахаваць вынікі гадавой працы кааператыва «Яхімаўшчызна», адзначыць ганаровымі граматамі і падарункамі ўдарнікаў працы. У ноч з 6-га на 7-е ліпеня тут адбываецца самае цікавае — на невялічкай выспе пасярод азярца запальваецца купальскае вогнішча, а на драўляных мастках, якія злучаюць выспачку з берагам, адбываецца святочны канцэрт. Паўсюль шмат моладзі, гучаць купальскія песні, чуюцца вясёлыя жарты і смех. Людзі пасля турбот і працы быццам вяртаюцца ў далёкія пракаветныя часіны і судакранаюцца з бяздоннай прыгажосцю сваёй мінуўшчыны. І ў гэты час яны шчаслівыя, кожны з іх верыць у цуд, у тое, што калі-небудзь абавязкова знойдзе сваю папараць-кветку.

*Верыць у цуды, безумоўна, трэба, без гэтага нельга. Але сапраўдны цуд — гэта наша Беларусь і тыя людзі, якія спрадвеку жывуць на яе землях, нягледзячы на складаны і цяжкі гістарычны лёс, застаюцца шчырымі і адданымі сваёй Бацькаўшчыне. Такія людзі вартыя таго, каб у іх нараджаліся вялікія паэты, песняры, выказнікі іх роздумаў і спадзяванняў. Некалі на гэтай зямлі ўжо нарадзіўся такі паэт, паэт з сусветнай славай, прарок нашага новага Адраджэння, класік беларускай літаратуры — Янка Купала.*